УДК 378.1+94(476)

**С. Г. Далюк, А. В. Лепеш**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

# АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ І НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ ПОЛІТЭХНІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ Ў ДАВАЕННЫ ЧАС (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПАЛІТЭХАЎСКАЙ ШМАТТЫРАЖКІ)

Артыкул прысвечаны даследаванню арганізацыі вучэбнага працэсу, навуковай дзейнасці, кадравай палітыкі ў Беларускім політэхнічным інстытуце ў 1930-я – пачатку 1940-х гг. – першапачатковы этап дзейнасці вядучага тэхнічнага ўніверсітэта. Асноўнай крыніцай для напісання артыкула стала газета, якая выдавалася Беларускім політэхнічным інстытутам з 1935 г. – першапачатковая назва «За пролетарскага інжынера», а з 1938 г. – «Савецкі інжынер». У той перыяд шматтыражка друкавалася пераважна на беларускай мове.

Публікацыя дазволіла выявіць не толькі поспехі студэнтаў у вучобе, спорце і навуковай дзейнасці, але і асаблівасці іх паўсядзённага побыту, унутраныя праблемы інстытута, а таксама спецыфіку кадравай палітыкі. У артыкуле прыводзяцца звесткі пра даваенны ўзровень падрыхтоўкі і пісьменнасці студэнтаў, сярэднюю паспяховасць, якасць дыпломных праектаў, меры па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу і прыцягненні кваліфікаваных спецыялістаў. Артыкул паказвае, як фарміравалася сістэма вышэйшай адукацыі, якія патрабаванні прад'яўляліся да студэнтаў, як спалучаліся вучоба, навуковая дзейнасць і пазавучэбнае жыццё. Даследаванне падкрэслівае ролю друкаваных крыніц у рэканструкцыі гісторыі ВНУ і фарміраванні ўяўлення пра развіццё вышэйшай тэхнічнай адукацыі ў даваенны перыяд.

**Ключавыя словы:** газета, даваенны час, гісторыя, пралетарскі інжынер, савецкі інжынер, політэхнічны інстытут.

**Для цытавання:** Далюк С. Г., Лепеш А. В. Арганізацыя вучэбнага працэсу і навуковай дзейнасці ў Беларускім політэхнічным інстытуце ў даваенны час (па матэрыялах палітэхаўскай шматтыражкі) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2025. № 2 (299). С. 38–42.
DOI: 10.52065/2520-6885-2025-299-7.

**S. G. Daliuk, A. V. Lepesh**
Belarusian National Technical University

# ORGANIZATION OF THE EDUCATIONAL PROCESS AND SCIENTIFIC ACTIVITIES AT BELARUSIAN POLYTECHNIC INSTITUTE IN THE PRE-WAR TIME (BASED ON MATERIALS FROM THE POLYTECHNIC MASS CIRCULATION NEWSPAPER)

The article is devoted to the study of the organization of the educational process, scientific activity, personnel policy at Belarusian polytechnic institute in the 1930s – early 1940s – the initial stage of the leading technical university. The main source for writing the article was a newspaper published by the Belarusian Polytechnic Institute since 1935 – the original title was «For the Proletarian Engineer», and since 1938 – «Soviet Engineer». At that time, the newspaper was published mainly in Belarusian.

The publications allowed us to reveal not only the successes of students in studies, sports and scientific work, but also the features of their everyday life, the internal problems of the institute, as well as the specifics of personnel policy. The article provides information on the pre-war level of training and literacy of students, average academic performance, the quality of diploma projects, measures to improve the educational process and attract qualified specialists. The study emphasizes the role of printed sources in the reconstruction of the history of universities and the formation of an objective idea of the development of higher technical education in the pre-war period.

**Keywords:** newspaper, pre-war period, history, proletarian engineer, soviet engineer, polytechnic institute.

**For citation:** Daliuk S. G., Lepesh A. V. Organization of the educational process and scientific activities at Belarusian Polytechnic Institute in the pre-war time (based on materials from the polytechnic mass circulation newspaper). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2025, no. 2 (299), pp. 38–42 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6885-2025-299-7.

**Уводзіны.** У даваенны час перыядычны друк, звязаны з дзейнасцю Беларускага політэхнічнага інстытута (далей – БПІ), быў прадстаўлены газетай «За пролетарскага інжынера», якая бярэ свой пачатак ад 23 красавіка 1935 г. З 2 лістапада 1938 г. газета стала выходзіць пад назвай «Савецкі інжынер» і мела такую назву да 1993 г. Час з'яўлення гэтай шматтыражкі супаў з перыядам станаўлення Савецкай Беларусі і фарміраваннем новага ўкладу жыцця, які закрануў палітыку, эканоміку і культуру. Асноўная танальнасць газеты разам з яе ідэалагічнай накіраванасцю – выкрыццё праблемных момантаў жыцця інстытута, звязаных з арганізацыяй навучальнага працэсу, культурна-масавай і спартыўнай работы, працы месцаў харчавання, а таксама ўмоў пражывання ў інтэрнатах. Газета выдавалася на беларускай мове, невялікая колькасць артыкулаў была напісана па-руску.

Аўтарамі артыкулаў у палітэхаўскай шматтыражцы маглі быць выкладчыкі і кіраўніцтва інстытута, калі гэта тычылася, напрыклад, агляду пытанняў партыйнага будаўніцтва ў краіне і сімвалічных савецкіх святаў, аналізу функцыянавання кафедраў, бягучай і выніковай атэстацыі студэнтаў; прафсаюзныя, камсамольскія лідары, якія асвятлялі вынікі працы або заганныя з'явы ў дзейнасці дадзеных арганізацый; самі студэнты, якія пісалі пра тое, чым яны не задаволены ў інстытуце і ў інтэрнаце, што іх хвалявала і турбавала. Прычым студэнцкія выступы на старонках газеты характарызаваліся вастрынёй, высокай ступенню крытычнасці, яны нагадвалі хутчэй скаргі, чым артыкулы. А адсюль аўтарства такіх выступленняў часам было ананімнае (што дапускалася рэдакцыяй), калі студэнт не паказваў сваё прозвішча і ставіў толькі першую ці апошнюю яго літары або ў канцы падпісваўся абстрактна: «студэнт», «механік», «дыпломнік» і г. д. Яскрава відаць, што калектыў рэдакцыі і яе пазаштатны карэспандэнцкі актыў нязменна імкнуліся быць на вастрыі падзей вядучай тэхнічнай ВНУ краіны. І, трэба аддаць належнае, кіраўніцтва інстытута хутка рэагавала на недахопы, выкрытыя на старонках газеты, і імкнулася іх выправіць у найбліжэйшы час. Напрыклад, так былі створаны шматлікія гурткі па інтарэсах, радыёвузел, каса ўзаемадапамогі для студэнтаў, прымаліся меры па ўстанаўленні дысцыпліны і парадку як у інстытуце, так і ў інтэрнатах, удасканальваліся мерапрыемствы па арганізацыі працы ВНУ са студэнтамі па розных накірунках (вучэбны, навукова-даследчы, выхаваўчы).

**Асноўная частка.** Аналіз базы артыкулаў шматтыражкі БПІ за красавік 1935 – май 1941 г. дазваляе скласці ўяўленне пра функцыянаванне інстытута, яго ўнутраныя паблемы, матэрыяльна-тэхнічную базу, паўсядзённае жыццё студэнтаў. Адзначым, што 30-я гг. XX ст. – перыяд актыўнага стаханаўскага руху ў савецкай краіне, сацыялістычных спаборніцтваў, прагі да паляпшэння паказчыкаў па выкананні планаў. Вынікі сацыялістычных спаборніцтваў падводзіліся штогод. Напрыклад, у кастрычніку 1939 г. былі падлічаны вынікі працы інстытута за 1938/1939 навучальны год. Асабліва добрых паказчыкаў дабіўся механічны факультэт (дэкан Федэр А. Я.), дзе назіраўся найвышэйшы працэнт паспяховасці з сярэдняй адзнакай па факультэце 4,00–4,38 (па пяцібальнай шкале). У спаборніцтвах удзельнічалі не толькі структурныя падраздзяленні БПІ, але і студэнцкія групы і персанальна студэнты. Некаторыя групы заключалі з інстытутам так званыя сацыялістычныя дагаворы, згодна з якімі, напрыклад, абяцалі здаць сесію (або пэўны экзамен, у прыватнасці па асновах марксізму-ленінізму) не ніжэй за «добра» і без запазычанасцяў. Уражвае памер прэмій, які атрымлівалі самыя перадавыя групы: ад 1000 да 2000 руб. [1, арк. 37]. На той момант гэта былі значныя грошы. Напрыклад, у 1936 г. заробак прафесара складаў каля 1300 руб., дацэнта – 900 руб. [2, арк. 109].

У перадваенныя гады ў БПІ функцыянавалі чатыры факультэты – будаўнічы, хіміка-тэхналагічны, торфамеханічны і гідрамеліярацыйны, механічны і вячэрняе аддзяленне [3, арк. 18]. У структуру інстытута ў 1940 г. уваходзілі 32 кафедры, на якіх працавалі каля 180 выкладчыкаў і навукоўцаў [4, арк. 6].

Колькасць студэнтаў у БПІ ў другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. павялічылася. Калі ў 1936 г. налічвалася каля 1700 студэнтаў [5, арк. 36], то ў пачатку 1940 г. іх было ўжо каля 2000 [4, арк. 6].

Навучанне ў ВНУ СССР першапачаткова было поўнасцю бясплатным. У 1940 г. СНК СССР выдаў загад аб устанаўленні платнасці навучання ў старэйшых класах школ і вышэйшых навучальных установах СССР і аб змене парадку прызначэння стыпендый. Абгрунтаванне неабходнасці ўвядзення платы за навучанне было звязана з павелічэннем узроўню матэрыяльнага дабрабыту працоўных, што дазволіла накіраваць частку выдаткаў на будаўніцтва, абсталяванне і ўтрыманне сеткі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў [4, арк. 21]. Такім чынам, з 1 верасня 1940 г. была ўведзена плата за навучанне ў ВНУ. Памер платы для ВНУ г. Мінска, як сталіцы БССР, складаў 400 руб. на год, якая ўносілася роўнымі часткамі: да 1 верасня і да 1 лютага. Студэнты з вельмі бедных сем'яў ад платы вызваляліся [4, арк. 21].

З 1 лістапада 1940 г. уносіліся карэктывы і па налічэнні стыпендыі. Яе маглі атрымаць толькі найбольш здольныя: судэнты першага курса, якія былі прыняты ў ВНУ без іспытаў як выдатнікі сярэдняй школы, а таксама тыя, хто

атрымаў на прыёмных іспытах не менш як дзве трэці адзнак «выдатна», а астатнія – не ніжэй як «добра»; студэнты другога курса, якія атрымалі на вясенняй экзаменацыйнай сесіі не менш як дзве трэці адзнак «выдатна», а астатнія – не ніжэй за «добра» [4, арк. 23]. Выбітныя студэнты, якія паспяхова сумяшчалі вучобу з навукова-даследчай і грамадскай работай, маглі атрымаць і сталінскую стыпендыю. У 1940 г. такіх стыпендыятаў было 9 чалавек [4, арк. 13].

Вучэбны працэс у інстытуце мала чым адрозніваўся ад сучаснага. Студэнты наведвалі калоквіумы, выконвалі лабараторныя работы, здавалі залікі і іспыты ў сесійны перыяд, праходзілі практыку, абаранялі дыпломныя праекты. Асноўныя веды па прадмеце навучэнцы атрымлівалі ў выніку наведвання лекцый і іх канспектавання, а таксама з навуковых кніг, якія можна было атрымаць у бібліятэцы. Як найлепшым чынам засвоіць новы матэрыял, падзяліўся ў газеце выдатнік вучобы А. Качынскі. Ён лічыў, што лекцыю патрэбна слухаць так, каб пасля яе заканчэння мець магчымасць паўтарыць асноўныя палажэнні, прапанаваныя лектарам. Калі ўзнікалі пытанні па матэрыяле лекцыі, іх неабходна было высвеtліць тут жа ў выкладчыка. Асаблівую ўвагу студэнт надаваў канспектаванню. Канспект ён вёў наступным чынам: інфармацыю, атрыманую ад выкладчыка на лекцыі, пісаў на адной старонцы сшытка, другая старонка ім запаўнялася па меры прапрацоўкі лекцыі дома з кнігай з тлумачэннямі, прыкладамі, разлікамі. Прычым гэта рабілася ў дзень чытання лекцыі, без адкладвання [5, арк. 11].

У сярэдзіне 1930-х гг. студэнты яшчэ вызначаліся нізкім узроўнем пісьменнасці, прабеламі ў ведах па матэматыцы, што перашкаджала ім глыбока вывучаць спецпрадметы. У 1936 г. дэканат хіміка-тэхналагічнага факультэта правёў праверку пісьменнасці ў справаздачах аб вытворчай практыцы студэнтаў 4-х і 5-х курсаў. Праверкай было ахоплена звыш паўсотні справаздач. Дэканату не ўдалося знайсці ніводнай работы, якая б у граматычных або стылістычных адносінах заслугоўвала адзнакі «выдатна», большасць работ утрымлівала вялікую колькасць граматычных і стылістычных памылак. З гэтай нагоды прапаноўвалася ўсім выкладчыкам працаваць над мовай студэнтаў шляхам вусных выступленняў і сумленнай праверкі пісьмовых работ [5, арк. 14]. Магчыма, такая сітуацыя тлумачылася тым, што студэнты мала чыталі, некаторыя з іх не працавалі з кнігамі ў бібліятэцы і не займаліся самастойна. Між іншым тэмы дыпломных праектаў як выніковых кваліфікацыйных работ, якія атрымлівалі старшакурснікі, былі вельмі сур'ёзнымі. Напрыклад, для будаўнічага факультэта – праект тэатра на 1500 чалавек, рачнога, чыгуначнага вакзала, палаца (для іх рэалізацыі яны маглі ездзіць нават на новабудоўлі ў Маскву і Ленінград [5, арк. 42]); для хіміка-тэхналагічнага – праект заводаў абліцовачных плітак, хімічнага посуду, каналізацыйных труб, пустацелых блокаў [1, арк. 32]. Тое, што вышэйназваныя дыпломныя работы паспяхова абаранялі студэнты БПІ, сведчыць пра высокі ўзровень выкладання і тэхнічнай адукацыі.

Сярэдні бал па інстытуце ў канцы 1930-х – пачатку 1940-х гг. на дзённым аддзяленні вагаўся ў межах 3,7–3,8 пры абсалютнай паспяховасці 74–80% [4, арк. 2, 41]. Новай дысцыплінай у вучэбных планах, да выкладання якой была павышаная ўвага, стала дысцыпліна «Асновы марксізму-ленінізму». Па ёй студэнты павінны былі актыўна рыхтавацца на семінарах праз вывучэнне твораў аўтараў марксісцка-ленінскай ідэалогіі, па якой здавалі іспыты [4, арк. 5, 8]. У 1940/1941 навучальным годзе былі ўпершыню ўведзены дзяржаўныя экзамены па замежных мовах [4, арк. 51].

Кіраўніцтва інстытута вяло барацьбу з пропускамі заняткаў, ліквідацыяй запазычанасцяў (адна з галоўных праблем!), выказвалася за паляпшэнне якасці выкладання прадметаў, добрую арганіацыю практыкі студэнтаў, якая магла праходзіць і за межамі рэспублікі. У гэтым кіраўніцтву дапамагалі самі студэнты праз інстытуцкую газету, у якой паказвалі тых, хто парушаў парадак і дысцыпліну, спазняўся на лекцыі, прапускаў заняткі без уважлівых прычын, перашкаджаў на лекцыях слухаць выкладчыкаў, дазваляў сабе грубыя адносіны да апошніх, карыстаўся шпаргалкамі на экзаменах. Так студэнты прымушалі дырэктара і дэканаў звярнуць увагу на недахопы ў працы інстытута, у тым ліку на дрэннае асвятленне ў аудыторыях [5, арк. 8], факты безгаспадарчасці [5, арк. 12], працу бібліятэкі і месцаў харчавання, методыку выкладання дысцыплін і г.д.

Паколькі БПІ ў 1933 г. аднавіў сваю дзейнасць пасля больш чым дзесяцігадовага перапынку, можна гаварыць фактычна аб пачатковым працэсе функцыянавання інстытута з шэрагам праблем у матэрыяльна-тэхнічным, арганізацыйна-метадычным, кадравым, навуковым плане. Інстытут толькі адбудаваў сваё памяшканне (сучасны галоўны корпус), унутры ўладкоўваў аўдыторыі і лабараторыі, ладзіў працу сталовай, бібліятэкі. Асабліва востра перад кіраўніцтвам інстытута стаяла задача аб прыцягненні пастаянных штатных работнікаў на выкладчыцкую работу па спецыяных дісцыплінах, бо такія дысцыпліны ў асноўным чыталі спецыялісты, якія працавалі па сумашчэнні з прадпрыемстваў або прыязджалі з Масквы. Так, напрыклад, на тарфяным факультэце на пачатак 1938 г. не было каму чытаць лекцыі па гідрапабудовах – вядучаму прадмету па

спецыяльнасці; на хімфаку – па механічным абсталяванні брадзільных прадпрыемстваў, на мехфаку – па разліку станкоў [1, арк. 26]. З гэтай нагоды быў узяты курс на выхаванне сваіх кадраў сярод таленавітай моладзі, якая актыўна ўцягвалася ў навукова-даследчую работу падчас сваёй вучобы ў інстытуце і затым атрымлівала накіраванне ў аспірантуру. Аспірант кафедры тэхналогіі шкла Мазелеў Л. Я. першым абараніў дысертацыю ў БПІ ў 1940 г. і стаў кандыдатам тэхнічных навук [4, арк. 6], што дазволіла яму заняць у хуткім часе пасаду дэкана хіміка-тэхналагічнага факультэта. У гэтым жа годзе ў БПІ былі абаронены яшчэ дзве дысертацыі – І. І. Рыжовым і Ф. К. Акалкоўскім, якім вучоны савет інстытута прысвоіў званне кандыдата тэхнічных навук [4, арк. 14]. І. І. Рыжоў пасля абароны дысертацыі стаў загадчыкам кафедры тэхналогіі керамікі (да яго прызначэння была ўкамплектавана выкладчыкамі, якія прыязджалі з Масквы ў БПІ на кароткі тэрмін). Малады загадчык павінен быў адразу вырашыць праблему жыццядзейнасці сваёй кафедры. Ужо да пачатку 1941 г. на кафедры працавалі выключна мясцовыя работнікі (удалося прыцягнуць траіх), што станоўча паўплывала на метадычную і навуковую работу кафедры і ВНУ ў цэлым [4, арк. 44].

Актывізацыя студэнцкай навукі прыносіла плён не толькі ў вырашэнні кадравай праблемы, калі раскрываліся талент і магчымасці студэнта як вынаходніка і навукоўца, але і ўзнімала прэстыж самога інстытута як вядучай тэхнічнай ВНУ. У 1938 г. на Усесаюзнай выставе па вынаходніцтве БПІ меў свой стэнд, дзе былі прадстаўлены распрацаваныя студэнтамі мадэлі. Там знаходзіліся работы студэнтаў механічнага факультэта, выкананыя пад кіраўніцтвам прафесара Галавіна Г. М., а таксама праект доследнага станка для абточвання мнагагранных валоў, аўтарам якога з'яўляўся лепшы вынаходнік інстытута – студэнт 5-га курса мехфака Эйг [1, арк. 12]. За гэтыя работы інстытут быў прэміраваны на суму 15 тыс. руб., што дазволіла набыць розныя экспанаты з Маскоўскага політэхнічнага музея [1, арк. 17]. Вопыт працы навукоўцаў політэхнічнага інстытута, у прыватнасці прафесара Галавіна Г. М., у напрамку цеснай сувязі навукі і вытворчасці пастановай Прэзідыума Цэнтральнага Савета Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў ад 04.11.1936 планавалася ўкараніць і ў іншых навучальных установах [5, арк. 35]. Вядома, што асістэнт кафедры будаўнічых вытворчасцяў Кацнельсон Р. Н. з'яўляўся вынаходнікам новага маразільнага апарата, які быў зарэгістраваны ў камітэце па справах вынаходніцтваў і атрымаў ухвалу ад шэрагу спецыялістаў. Больш таго, першы такі апарат быў выраблены ў майстэрнях інстытута [4, арк. 6]. У 1941 г. актывізаваць навукова-даследчую работу ў БПІ і сярод супрацоўнікаў, і сярод студэнтаў прапаноўвалася за кошт стварэння вытворчага сектара на базе лабараторый установы, што давала б магчымасць рэалізоўваць эксперыментальную частку навуковых распрацовак [4, арк. 50].

**Выснова.** Аналіз артыкулаў шматтыражнай газеты БПІ за 1935–1941 гг. дазваляе зрабіць выснову аб тым, што ў перадваенныя гады інстытут прайшоў вырашальны этап развіцця і заняў пазіцыю вядучай тэхнічнай ВНУ рэспублікі. Ён актыўна ўдзельнічаў у сацыялістычных спаборніцтвах, прымяняў матэрыяльныя і маральныя стымулы для павышэння актыўнасці студэнтаў. Адной з галоўных задач інстытута стала стварэнне ўласнага выкладчыцкага корпуса, што прывяло да актывізацыі студэнцкай навукі і падрыхтоўкі аспірантаў, многія з якіх хутка занялі кіраўнічыя пасады на кафедрах.

Нягледзячы на недахопы – нізкі ўзровень пісьменнасці часткі студэнтаў, дэфіцыт кваліфікаваных выкладчыкаў, матэрыяльныя цяжкасці – інстытут дэманстраваў устойлівы рост колькасці студэнтаў, пашырэнне факультэтаў і кафедраў, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Высокі ўзровень дыпломных праектаў, поспехі ў вынаходніцкай дзейнасці і першыя абароны кандыдацкіх дысертацый сведчаць пра тое, што да пачатку Вялікай Айчыннай вайны БПІ займаў ўжо трывалыя пазіцыі ў сістэме вышэйшай адукацыі. Важную ролю ва ўдасканаленні навучальнага працэсу адыграла інстытуцкая газета, у якой адзначаліся як поспехі, так і праблемы функцыянавання ўстановы, што дазволіла хутка рэагаваць на іх выпраўленне. Газета стала насіць не толькі інфармацыйны характар, але і набыла функцыі своеасаблівага грамадскага кантралёра.

## Спіс літаратуры

1. Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут // За пралетарскага інжынера, Савецкі інжынер. 1938, 1939 / Музей гіст. БНТУ. АГ-24 (АФ). 50 л. Архіўная копія.

2. Гуркина Н. К. Из истории государственного руководства высшей школой в России (проблемы статуса, квалификации, материального положения преподавателей) // Управленческое консультирование. 2023. № 5. С. 101–112.

3. Статут Беларускага політэхнічнага інстытута імя І. В. Сталіна: загад Усесаюз. кам. па справах вышэйшай школы пры СНК СССР, 7 жніўня. 1939 г., № 5/424 / Музей гіст. БНТУ. Д-4 (АФ). 28 с. Арыгінал.

4. Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут // Савецкі інжынер. 1940, 1941 / Музей гіст. БНТУ. АГ-25 (АФ). 54 арк. Архіўная копія.

5. Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут // За пролетарскага інжынера. 1935, 1936, 1937 / Музей гіст. БНТУ. АГ-23 (АФ). 48 арк. Архіўная копія.

**References**

1. Belarusian Order of the Red Banner of Labor Polytechnic Institute. *Za proletarskaga inzhynera, Savetski inzhyner*, 1938, 1939. Museum of the History of the BNTU. AG -24 (MF). 50 p. Archive copy (In Belarusian).

2. Gurkina K. N. From the history of state management of higher education in Russia (problems of status, qualifications, financial situation of teachers). *Upravlencheskoye konsul'tirovaniye*, 2023, no. 5, pp. 101–112 (In Russian).

3. *Statut Belaruskaga politekhnichnaga instytuta imya I. V. Stalina: zagad Usesayuznaga kamiteta pa spravakh vysheyshay shkoly pry SNK SSSP, 7 zhniunya 1939 g., № 5/424* [Statute of the Belarusian Polytechnic Institute named after I. V. Stalin: order of the All-Union Commissariat for Higher Education Affairs under the Council of People's Commissars of the USSR, 7 Aug. 1939, 5/424]. Museum of the History of the BNTU. D-4 (MF). 28 p. Original (In Belarusian).

4. Belarusian Order of the Red Banner of Labor Polytechnic Institute. *Savetski inzhyner* [Soviet engineer], 1940, 1941. Museum of the history of BNTU. AG-25 (MF). 54 p. Archive copy (In Belarusian).

5. Belarusian Order of the Red Banner of Labor Polytechnic Institute. *Za proletarskaga inzhynera* [For the proletarian engineer], 1935, 1936, 1937. Museum of the History of the BNTU. AG-23 (MF). 48 p. Archive copy (In Belarusian).

**Інфармацыя пра аўтараў**

**Далюк Святлана Генадзеўна** – вядучы спецыяліст музея гісторыі БНТУ, старшы выкладчык кафедры «Гісторыя». Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (пр-т Незалежнасці, 65, 220005, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь). E-mail: kafhistory@bntu.by

**Лепеш Аксана Васілеўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры «Гісторыя». Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (пр-т Незалежнасці, 65, 220005, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь). E-mail: lepesh@bntu.by

**Information about the authors**

**Daliuk Sviatlana Genadzeuna** – leading specialist of the Museum of History of BNTU, Senior Lecturer, the Department of History. Belarusian National Technical University (65 Nezalezhnasti Ave., 220005, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: kafhistory@bntu.by

**Lepesh Aksana Vasileuna** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History. Belarusian National Technical University (65 Nezalezhasti Ave., 220005, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: lepesh@bntu.by

*Паступіў 05.09.2025*